**Тэма:** Абагульняючы ўрок па тэме “Жывая кніга беларускай прыроды”

**Мэта:** абагульніць веды вучняў па тэме “Жывая кніга беларускай прыроды”.

**Задачы**:

фарміраваць уменне чытаць правільна і асэнсавана, удасканальваць навык выразнага чытання, ствараць умовы для развіцця ўмення вызначаць агульную тэматыку некалькіх твораў;

фтвараць умовы для развіцця творчых здольнасцей вучняў;

садзейнічаць выхаванню ўважлівых і беражлівых абносін да прыроды роднага краю.

**Тып урока:** абагульненне вывучанага.

ХОД УРОКА

1. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЭТАП

Завіталі сёння ў класс,
Хто чакае сёння нас?
Вось падручнік і малюнкі,
А тут вершы – падарункі.
Фотаздымкі пра жывел,
І пра тое, як жывем.
Мы жадае ужо чытаць,
На прыродзе пабываць.

- Як вы думаеце, якія якасці спатрэбяцца сення нам на ўрку?
- А яшчэ нам абавязкова спатрэбяцца такія якасці, як уважлівасць і павага адзін да аднаго.
- Сення на уроку я прапаную вам сыграць у літаратурнае бінга. Перад вамі гульневае поле. Кожная клетка яго мае свій нумар і свае заданне. Калі вы правільна выканаеце заданне, то клетка гульневага поля будзе адкрыта і там з’явіцца пэўная літара.
- Вы гатовы да гульні? Тады запрашаю.

2. МАЎЛЕНЧАЯ РАЗМІНКА

Ор-ор-ор-ор – назаві любімы (твор).
Эх-эх-эх-эх – зноў тут з’явіцца (арэх).
Ор-ка-ор-ка-ор-ка-ор-ка – паскакала вунь (ваверка).
Едзь-едзь-едзь-едзь – быў у нас тут і (мядзведзь).

- Чытанне павольна, дадаючы ў канцы радка рыфму па сэнсе.
- Чытанне хутка, асэнсавана.
- Чытанне па форме “Ціха-гучна”

***Малайцы! Вы добра выканалі першае заданне , а значыць, можна адкрыць першую клетку*.**

3. УВОДЗІНЫ Ў ТЭМУ. МЭТАПАКЛАДАННЕ

Чытанне верша настаўнікам.

Хто ў лесе сустракае?
Як лясныя жыхары?
Дзе там Зайчык размаўляе?
Хто жыве ў траве, ў кары?
У арэхах хто сустрэўся?
І куды мядзведзь пайшоў?
Хто з рабіны ўраз наеўся?
Гаспадар чаго прыйшоў?

- Пра што вам нагадалі радкі гэтага верша? (Пра творы, якія мы чыталі)
- Давайце успомнім, як называўся раздзел, у якім былі змешчаны прачытаныя намі творы?

WDЖFыGjbszawqякJLнRQilfrdaDDбSNevлaRpWyGcJкYaUйVпLgрыfрoDWдYRQы

- Чаму мы называем прыроду кнігай?
- Якой тэмай былі аб'ядняня прачытаныя намі творы? (Прыродзе)
- Як мы павінны адносіцца да прыроды? Чаму?

***Малайцы! Мы можам адкрыць другую клетку.***

4. ***ЭТАП АБАГУЛЬНЕННЯ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ ВЕДАЎ ПА РАЗДЗЕЛЕ "ЖЫВАЯ КНІГА БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ"***

1. Каб адкрыць наступнае гульневае поле, нам трэба выканаць наступнае заданне.
   Прачытайце ўрыўкі з твораў. Успомніце іх назвы і прозвішчы аўтараў гэтых твораў. Чым вам запомніліся персанажы з гэтых твораў?.












***Малайцы! Мы можам адкрыць наступную клетку.***

2. ***Заданне на слайдзе: Дапоўніце ўрывак прапушчанымі словамі, успомніце яго назву і аўтара.***

| |
|---|
| Усе птушкі мову маюць,<br>мовай роднай размаўляюць,<br>мілагучнаю, сваёй, —<br>гэтак, як і мы з табой.<br><br>Птушыная мова<br>Васіль Жуковіч |

**Усе птушкі … маюць,**
**мовай …. размаўляюць,**
**… , сваёй, —**
**гэтак, як і … з … .**

***Работа ў парах:***



Вусна «збяры» са складоў назвы птушак. Успомні, хто як размаўляе. Злучы словы-дзеянні з выявамі птушак, што так робяць.

ля зю зя | ні сі ца | луб го | ро ка са | сел бу

шчабеча
ценькае
цёхкае
буркуе
стракоча
клякоча
кукуе

таў ка лас

са вей ла

***Малайцы! Мы можам адкрыць 4 клетку.***

***ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА***

3. А цяпер успомніце верш Антон Бялевіч “У лесе”.



Прачытай рэплікі. Злучы выказванні з малюнкамі герояў верша Антона Бялевіча «У лесе».

— Я ж арэхаў нанасіла.
Я грыбоў сабрала шмат!

— Лягу спаць я ў цёплы ложак —
Буду спаць да весніх дзён!

— Змерзну — бухнуся з бярозы
У снег. Пад снегам пражыву!

***Малайцы! Мы можам адкрыць 5 клетку.***

4. Работа у групах. Крытэрый ацэньвання – выразнасць.
   А цяпер запрашаю вас у міні-тэатр. Прапаную вам разбіцца на групы і прачытаць па ролях верш Антон Бялевіч “У лесе”.

***Узаемаадзнака чытання.***

**<u>Заслухванне 1-2 груп. Узаемаадзнака.</u>**

***Малайцы! Мы можам адкрыць 6 клетку.***

5. На мінулым уроку мы працывалі з апавяданнем Віталя Вольскага “Гаспадар пушчы”.
   - Каго пісьменнік называе гаспадаром пушчы? Чаму?

   Работа у парах.

Прачытайце словы. Выберыце з іх толькі тыя, якія падыходзяць да апісання зубра.

Вялікі, маленькі, дужы, магутная галава, худзенькі, лясны волат, кучаравая шэрсць, пушысты хвост, чорная барада, мускулістыя грудзі, высокі карак, калматая грыва, рыжая поўсць, тоўстыя ногі, хвост як у быка.

Праверка выканання задання.




***Малайцы! Мы можам адкрыць апошнюю клетку.***
***З адкрытых літар складзіце слова (ВЫДАТНА)***

6. ЭТАП ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ

- Малайцы, вы добра папрацавалі. А зараз падумайце і адкажыце, які твор з раздзела “Жывая кніга беларускай прыроды” вам запомніўся больш усяго? Чаму? (Пасля гэтага, каля партрэта паэтаці пісьменніка з’яўляецца матылек)

7. ЭТАП ІНФАРМАВАННЯ АБ ДАМАШНІМ ЗАДАННІ

- Падрыхтавацца да ўрока пазакласнага чытання па тэме “Жывая кніга беларускай прыроды”